№ 15 (320)
Красавік 2010 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

## У нумары:

Спадчына: *замкі Беларусі* – *стар. 3*

Радавод: *споведзь М. Мельнікава і «касмічны чалавек» Б. Кіт* – *стар. 5*

Кнігазбор: *гаспадар рэдкіх кніг* – *стар. 6*



Фота Наталі КУПРЭВІЧ

## Багушэвіцкая краязнаўчая канферэнцыя

25 сакавіка ў Ашмянскім краязнаўчым музеі імя Ф.К. Багушэвіча прайшла раённая канферэнцыя «Ф.К. Багушэвіч. Гонар і годнасць беларусаў», прымеркаваная да 170-годдзя з дня нараджэння слыннага пісьменніка.

Мерапрыемства пачалося з адкрыцця выстаўкі «Шануем памяць аб табе, наш славуты зямляк», якое правяла навуковы супрацоўнік музея В.У. Рэмізевіч. А пасля прывітальных словаў намесніка старшыні Ашмянскага райвыканкама А.А. Саванец і начальніка аддзела культуры Г.І. Балінскай да ўдзельнікаў і гасцей пачалося пленарнае пасяджэнне. Удзел бралі не толькі мясцовыя краязнаўцы, але і даследчыкі з Мінска.

Тэмы выступленняў былі разнастайныя. Даследчык жыцця і творчасці пісьменніка Уладзімір Содаль прачытаў даклад з інтрыгоўнай назваю «Жан Беранжэ ў Кушлянах», а калекцыянер і даследчык ашмянскай шляхты Васіль Юрша пазнаёміў з «Радаводам Багушэвічаў». Цікавыя выступленні падрыхтавалі і самі ашмянцы: настаўніца і кіраўнік школьнага музея Жупранскай СШ Галіна Лукша правяла віртуальную экскурсію па музеі Ф. Багушэвіча, бібліятэкар ЦБ Вольга Швец зрабіла агляд літаратуры «Шляхамі жыцця і творчасці Ф. Багушэвіча», Пётр Шакола прачытаў свае вершы, прысвечаныя славутаму земляку, навуковы супрацоўнік краязнаўчага музея Ірына Буслов іч выступіла з дакладам «Жыць, служыць і тварыць для народа».

Асобна варта адзначыць, што ў мерапрыемстве брала ўдзел немалая колькасць вучняў. Да канферэнцыі падрыхтавалі даклады 9-класніца Анжадаўскай базавай школы (БШ) Марта Буйноўская («На радзіме Багушэвіча»), 11-класніца СШ № 1 райцэнтра Анастасія Бенедзесюк («Сцежкамі Багушэвіча»), 8-класніца Гродзіеўскай БШ Ганна Багдановіч («Паўстанне ў лёсе Багушэвіча»), 9-класніца Клявіцкай БШ Надзея Станчык («Народны адвакат»), 8-класніца Граўжышкоўскай СШ Анастасія Дзятловіч («Паэтычная творчасць»), 9-класніца Кальчунскай СШ Вольга Аўсюкевіч («Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі…») і 9-класніца СШ № 3 райцэнтра Юлія Балейка («Я адчуваю сэрцам… повязь пакаленняў»).

Падвяла вынікі канферэнцыі дырэктар краязнаўчага музея Ж.І. Іванова.

***Ул. АДЗІМІР***

# Краязнаўчыя чытанні ў горадзе над Нёманам

***Напрыканцы сакавіка ў Гродне прайшлі юбілейныя X рэспубліканскія педагагічныя краязнаўчыя чытанні па тэме «Выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму, адказнасці за захаванне нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны сродкамі краязнаўчай дзейнасці».***

«Новы замак» – рэзідэнцыя апошняга вялікага князя літоўскага і караля польскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага – сустрэў педагогаў-краязнаўцаў з усіх рэгіёнаў краіны. А «Сенатарская зала» – месца прыняцця лёсавызначальных рашэнняў для дзяржавы, якая бачыла «маўклівае» пасяджэнне Гродзенскага сойма ў 1793 годзе, адрачэнне Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў лістападзе 1795 года, гасцінна адчыніла свае дзверы ў сонечныя веснавыя дні для ўдзельнікаў краязнаўчых чытанняў.

75 педагогаў-краязнаўцаў сустрэліся на Гродзенскай зямлі, каб абмяняцца досведам працы па выхаванні грамадзяніна і патрыёта краіны, абмеркаваць пытанні (якія хвалююць многіх) далучэння моладзі да вырашэння праблемаў захавання нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Непасрэдныя арганізатары чытанняў – Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі, Упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама, Гродзенскі дзяржаўны абласны цэнтр турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі.

Тэма юбілейных краязнаўчых чытанняў надзвычай актуальная і запатрабаваная ў наш супярэчлівы час. Сёння асабліва важнай бачыцца роля патрыятызму ў выхаванні маладога пакалення, заснаванага на ашчадным стаўленні да нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Удзельніца педагагічных чытанняў, кіраўнік клуба «Радавод» Капаткевіцкай САШ Петрыкаўскага раёна Надзея Адамаўна Сігай выказала сапраўдны сэнс патрыятызму: «Патрыятычнае пачуццё не прыроджанае, яно фармуецца на працягу ўсяго працэсу выхавання дзіцяці. Гэта глыбіннае ўспрыманне самасвядомасці асобы, якое акумулюе ў сабе эмацыйна-станоўчыя адносіны да сваёй краіны, яе гісторыі, культуры, мовы, прыроды, грамадства і праяўляецца ў імкненні ўдзельнічаць у жыцці Радзімы і прыкласці максімальныя намаганні для яе росквіту і захавання культурна-гістарычнай непаўторнасці». Гэтая думка прайшла чырвонай ніткай у выступленнях педагогаў-краязнаўцаў.

Грамадзянскасць, патрыятызм – гэта «замілаванне да тых мясцінаў, дзе чалавек нарадзіўся і вырас», гэта «гонар за сацыяльныя і культурныя дасягненні Радзімы», гэта «павага да гістарычнага мінулага сваёй краіны і атрыманых у спадчыну традыцыяў», гэта «паважлівае стаўленне да роднай мовы», а таксама «імкненне прысвячаць сваю працу, сілы і здольнасці росквіту Радзімы».

«Моладзь цяпер знаходзіцца ў няпростай сітуацыі, спрабуе набыць жыццёвыя арыенціры, – зазначыў намеснік дырэктара Нісімкавіцкага навучальна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад-сярэдняй школы Чачэрскага раёна Аляксандр Сяргеевіч Ганчароў. – Дапамагчы зрабіць правільны выбар на гэтым складаным шляху станаўлення асобы грамадзяніна закліканыя мы, настаўнікі».

У апошнія гады нарадзіліся новыя падыходы ў арганізацыі краязнаўчай дзейнасці, назапашаны багаты досвед вядзення краязнаўчай працы. І тэматыка выступленняў удзельнікаў юбілейных чытанняў была надзвычай разнастайная, актуальная і запатрабаваная. Педагогі з задавальненнем дзяліліся каштоўнымі напрацоўкамі, расказвалі пра свае метадычныя і даследчыя набыткі.

Так, гурткоўцы Цэнтра пазашкольнай працы Наваполацка, расказала кіраўнік краязнаўчага гуртка Ніна Анатольеўна Сабітнюк, даследуюць мегалітычныя аб'екты на тэрыторыі старажытнай Полацкай зямлі, а менавіта – адзіную ў Беларусі старажытную астранамічную абсерваторыю, вядомую як «Полацкі Стоўнхендж», што знаходзіцца на паўвостраве возера Янава, прыкладна за 25 км ад Полацка («КГ» пісала пра гэты аб'ект). Беларусь не ведае такой вялікай колькасці мегалітычных помнікаў, як на Полаччыне.

Тэма выступлення «Краеведение – Краелюбие – Краегордость» была ў намесніка дырэктара Кальчунскай СШ Ашмянскага раёна Таццяны Ягораўны Давідовіч. Праца ў яе канкрэтная, са сваімі вынікамі і дасягненнямі. А вынікі – кніга «З мінулым у будучыню», своеасаблівая «даніна памяці, павагі і ўдзячнасці» Анджэю Снядэцкаму, выдатнаму вучонаму, заснавальніку сучаснай хіміі, біёлагу, медыку, педагогу, сацыёлагу, які «нарадзіўся ў Польшчы, усё жыццё працаваў у Вільні, а спачываць вечна пажадаў у Беларусі». Вынік працы – гэта і гісторыка-краязнаўчы музей у школе, дзе цэнтральнае месца займае раздзел, прысвечаны знакамітаму вучонаму эпохі Асветы. «За два кіламетры ад нашай школы знаходзіцца вёска Болтуп, у якой чырвоным друзам ляжаць руіны некалі прыгожага маёнтка. Яшчэ за два кіламетры – вёска Гароднікі. Там ёсць могілкі, дзе стаіць помнік, белы мармур… Аказваецца, усё гэта звязанае са знакамітай асобай выдатнага вучонага Анджэя Снядэцкага».

*(Заканчэнне на стар. 2)*

# Краязнаўчыя чытанні ў горадзе над Нёманам

(*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*)

Неабходна падкрэсліць вялікую ролю музеяў у адраджэнні і захаванні набыткаў нацыянальнай культуры народа і ў выкарыстанні іх у навучальна-выхаваўчым працэсе. Зараз ва ўстановах адукацыі краіны працуе прыкладна паўтары тысячы музеяў.

Праца вучняў у школьным музеі, клопат аб яго экспанатах, музейных прадметах, прапаганда сваёй дзейнасці сярод равеснікаў аказваюць уздзеянне на светапогляд, жыццёвыя інтарэсы вучня, развіваюць творчыя і інтэлектуальныя якасці асобы, садзейнічаюць больш глыбокаму разуменню асабліваcцяў мясцовага гістарычнага і культурнага жыцця.

Вельмі важна, каб музей удзельнічаў у рашэнні навучальных і выхаваўчых задачаў установы адукацыі, а гэта звязанае з уменнем гарманічна аб'яднаць навучальную і выхаваўчую працу, падпарадкаваць іх галоўнай мэце – фармаванню асобы.

Да важнай ролі музея ў грамадзянскім і патрыятычным выхаванні моладзі ва ўстановах адукацыі звярнуліся ў сваіх выступленнях кіраўнік этнаграфічнага музея СШ № 215 Мінска Іна Аляксандраўна Крыжаноўская, кіраўнік музея баявой і працоўнай славы Жодзінскай СШ № 4 Аляксандр Іванавіч Ляшчэня, намеснік дырэктара СШ № 209 Мінска Сняжана Анатольеўна Мірко ды іншыя.

На чытаннях прайшло азнаямленне з «Віртуальным музеем», які працуе ў Слаўгарадскім дзяржаўным прафесійным ліцэі № 3, ім кіруе Аляксандр Яўгенавіч Халееў. У апошні час моладзь усё часцей звяртаецца па інфармацыю ў «сусветную павуціну». Досвед паказвае, што магчымасці камп'ютэрных тэхналогіяў можна і неабходна выкарыстоўваць для актывізацыі краязнаўчай працы.

Віртуальны музей – тып вэбсайта, аптымізаваны для экспазіцыі самых розных музейных матэрыялаў, «ад прадметаў мастацтва і гістарычных артэфактаў да віртуальных калекцыяў і фамільных рэліквіяў».

Перадумовамі ўзнікнення «Віртуальнага музея», расказаў Аляксандр Яўгенавіч, стала тое, што ў горадзе «з такой слаўнай гісторыяй» не было «рэальнага краязнаўчага музея». Каб пашырыць веды пра горад і раён, у Слаўгарадскім ліцэі з 2006 года актыўна працуе «Віртуальны музей "Спадчына"», які выконвае сваю выхаваўчую, папулярызацыйную і прапагандысцкую функцыі.

Пераемнасць пакаленняў – гэта традыцыі, калектыўная памяць народа, тое, што «прайшло праз стагоддзі, эпохі, фармацыі, укаранілася ў ладзе жыцця, побыце, норавах, мове». На актуальнасці грамадзянскага і патрыятычнага выхавання моладзі на аснове даследавання мясцовых народных традыцыяў засяродзіла ўвагу краязнаўцаў кіраўнік гуртка «Спадчына» Галавінскай СШ Гомельскага раёна Алена Мікалаеўна Чыркова.

«Вучні нашай школы адчулі значнасць сваёй работы, – казала Алена Мікалаеўна, – пранікліся тым, што раней імі было незаўважаным. Звычайная вёска, звычайныя жыхары, звычайная рака, палі і лугі. Усё гэта, казалі дзеці ў шчырай гутарцы са мной, раней было не такім таемным, цікавым, жаданым, нейкім звычайным. Гэта дае падставу меркаваць, што дзеці атрымліваюць тое неабходнае, без чаго не можа існаваць звычайны чалавек: без любові да Радзімы, да роднага куточка, сваёй хаты». У гэтым і ёсць вялікі сэнс патрыятычнага выхавання.

Калі педагог-краязнаўца – чалавек творчы, таленавіты, то гэта абавязкова знойдзе сваё адлюстраванне і ў выхаванцах. У праўдзівасці гэтага сцвярджэння пераконваешся з выступлення кіраўніка краязнаўчага музея Ленінскай СШ Горацкага раёна Сяргея Іванавіча Лоцманава. Ён сваімі глыбокімі, пранікнёнымі вершамі ўразіў удзельнікаў краязнаўчых чытанняў.

Так атрымалася, што Гродзенская зямля стала месцам збору педагагічнай эліты краязнаўчага кірунку. Кандыдат гістарычных навук, настаўнік Лужасянскай гімназіі, што на Віцебшчыне, Мікалай Васільевіч Півавар пазнаёміў удзельнікаў чытанняў з праблемамі стварэння бібліяграфічнага даведніка «Краязнаўцы Віцебшчыны», кіраўнік гісторыка-краязнаўчага музея Іванскай СШ-сада, што ў Чашніцкім раёне, Віктар Вільгельмавіч Грыбко распавёў аб стварэнні ім і выкладанні ў рэгіёне курсу «Чашніказнаўства», метадыст аддзела краязнаўства Цэнтра турызму, краязнаўства і экскурсіяў Бабруйска Святлана Аксенцьеўна Семчанка наглядна паказала выкарыстанне інтэрактыўных тэхналогіяў пры арганізацыі і правядзенні краязнаўчых экскурсіяў з навучэнцамі.

Кіраўнік Народнага музея «Гісторыя Заронаўскага краю», што на Віцебшчыне, Людміла Канстанцінаўна Нікіціна паказала, якім цікавым для навучэнцаў можа быць музей, калі яго экспанаты «ажываюць», калі скарыстаць гумар, гульні, песні...

З сістэмай краязнаўчай працы ў эколага-краязнаўчым клубе «Выток» СШ № 7 Кобрына пазнаёміў яго кіраўнік Сяргей Мікалаевіч Соўпель. Удзельнікі клуба – неаднаразовыя пераможцы конкурсаў, што праходзяць у рамках рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», удзельнікі рэспубліканскіх летнікаў, пераможцы рэспубліканскай краязнаўчай алімпіяды. Менавіта гэта і ёсць вынікам той вялікай краязнаўчай працы, якую праводзіць Сяргей Мікалаевіч.

Блокам прагучала тэма вайны. Выхаванне моладзі на гераічных старонках Вялікай Айчыннай набывае асаблівы акцэнт напярэдадні святкавання 65-годдзя Вялікай Перамогі. У выступленні кіраўнік краязнаўчага музея Куршынавіцкай СШ Ляхавіцкага раёна Марына Іванаўна Станіславовіч зазначыла: «У школе ідзе пошукавая праца, даследуецца баявы шлях настаўніка школы, былога вязня канцэнтрацыйных лагераў Паўла Адамавіча Мілюка. Матэрыялы выкарыстоўваюцца на ўроках гісторыі і ўроках Памяці, прысвечаных 65-й гадавіне Вялікай Перамогі, а таксама сталі здабыткам грамадскасці праз "Краязнаўчую газету", праз навукова-метадычны часопіс "Гісторыя: праблемы выкладання" ды іншыя крыніцы».

«На наш погляд, вельмі важна сфармаваць у дзяцей разуменне таго, што гісторыя, росквіт і лёс краіны ствараецца людзьмі, якія жывуць побач з намі, простых абаронцаў і працаўнікоў», – такая думка прагучала ў выступленні настаўніцы Плешчыцкай СШ Пінскага раёна Зінаіды Анатольеўны Дубінецкай. А разуменне гэтага прыходзіць дзякуючы сумесным намаганням грамадскасці, педагогаў, навучэнцаў. І квітнее штогод у школе сад Памяці, пасаджаны ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны разам з навучэнцамі, і папаўняецца новымі фактамі, падзеямі школьная кніга Памяці, старонкі якой расказваюць аб продках навучэнцаў школы, лёсы якіх апаліла Вялікая Айчынная. Усё гэта садзейнічае сувязі розных пакаленняў, выхоўвае пашану да памяці герояў, якія аддалі свае жыцці за Вялікую Перамогу.

«Халакост на Дзятлаўшчыне» – яшчэ адна тэма вайны. «У гады Вялікай Айчыннай вайны нашая маленькая шматнацыянальная радзіма Дзятлаўшчына страціла каля 20 тысячаў яўрэяў, – распавяла настаўніца тамтэйшай гімназіі № 1 Жанна Славаміраўна Нагавонская. – Гэты праект мае на мэце садзейнічаць выхаванню ў навучэнцах талерантнасці, неабходнасці канструктыўнага ўзаемадзеяння з людзьмі і групамі людзей незалежна ад іх нацыянальнасці, сацыяльнай, рэлігійнай прыналежнасці, іх поглядаў і светаўспрымання». А вынікам стала стварэнне новай экспазіцыі ў музеі і актыўнае яе папаўненне, новыя сувязі з ЗША, Канадай, Расіяй, Ізраілем, а таксама ўключэнне ў краязнаўчую працу навучэнцаў, педагогаў, бацькоў.

*Праграма краязнаўчых чытанняў дазволіла педагогам-краязнаўцам не толькі абмяняцца сваімі напрацоўкамі, але і пазнаёміцца з чароўным, таямнічым, гістарычным, ахутаным атмасферай высокай духоўнай культуры, горадам над Нёманам.*

***Аляксандра КРАВЕЦ,***
***загадчыца аддзела краязнаўства РЦТіКНМ***


**Падпіска на «Краязнаўчую газету» – з любога месяца**

| Індывідуальная падпіска | | Ведамасная падпіска | |
|---|---|---|---|
| Індэкс **63320** | | Індэкс **633202** | |
| 1 месяц | 4 500 руб. | 1 месяц | 4 725 руб. |
| 3 месяцы | 13 650 руб. | 3 месяцы | 14 175 руб. |
| 6 месяцаў | 27 300 руб. | 6 месяцаў | 28 350 руб. |

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

**АБАНЕМЕНТ** *на газету* 63320 (індэкс выдання)

**Краязнаўчая газета**

Колькасць камплектаў

на 200_ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету 63320 (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

**Краязнаўчая газета**

Кошт: падпіскі ________руб.; пераадрасоўкі ________руб. Колькасць камплектаў

на 200_ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)


# Зварот Міністра адукацыі да ўдзельнікаў краязнаўчых чытанняў

***Паважаныя педагогі-краязнаўцы!***

Віншую вас з юбілейнымі Х рэспубліканскімі педагагічнымі краязнаўчымі чытаннямі.

Ваша мэтанакіраваная работа садзейнічае выхаванню сапраўднага грамадзяніна сваёй краіны, якому прыйдзецца прымаць актыўны ўдзел у рашэнні перспектыўных задач развіцця нашай дзяржавы, выконваць функцыі гаспадара і працаўніка.

Ад вынікаў вашай працы ў многім залежаць патрыятычныя памкненні будучых пакаленняў, захаванне культуры, развіццё традыцый, якія звязаны з усялаўленнем роднага краю.

На розных узроставых ступенях вельмі важна выхаваць у дзяцей павагу да гістарычнага мінулага народа, беражлівыя адносіны да народнай памяці, да тых людзей, хто сваёй дзейнасцю ўзбагаціў нацыянальную і агульначалавечую культуру.

Менавіта вы з'яўляецеся тым маяком, які асвятляе шлях да спазнання свайго краю, яго унікальнай, самабытнай культуры, яго багатай гісторыі, яго таленавітых і творчых людзей.

Дзякуючы вашым намаганням ужо пяты год па краіне паспяхова крочыць рэспубліканская акцыя «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», якая з'яднала навучэнскую моладзь жаданнем пазнаваць, вывучаць і захоўваць сваю родную спадчыну.

Не без вашага ўдзелу працуюць ва ўстановах адукацыі каля 1,5 тыс. музеяў, у якіх жыве гісторыя сівой даўніны, дзе адбываюцца віртуальныя сустрэчы з продкамі-суайчыннікамі, дзе ўзнаўляюцца гістарычныя повязі з гераічнымі і трагічнымі падзеямі роднага краю. Музей – гэта сапраўдны скарб краязнаўчых ведаў.

І вы ўмееце выкарыстаць гэты скарб у выхаваўчых мэтах.

Выхаванне маладога пакалення на геранчнай гісторыі Вялікай Айчыннай вайны складае важны аспект вашай работы і набывае асаблівае значэнне напярэдадні святкавання 65-годдзя Вялікай Перамогі. Кожнае новае пакаленне па-свойму асэнсоўвае старонкі ваеннай гісторыі. Менавіта вы дапамагаеце сваім выхаванцам правільна асэнсаваць важныя падзеі ваеннага ліхалецця, захаваць памяць аб вялікім подзвігу народа-пераможца.

Дзякуючы вашым творчым намаганням усё новае ў краязнаўстве становіцца здабыткам вашых выхаванцаў.

Няхай прафесіяналізм, пошук, наватарства і далей дапамагаюць вам у дасягненні высакародных мэт, цярплівасці вам у пераадоленні цяжкасцей і разважлівасці ў ацэнцы хуткаплынных падзей.

***Міністр адукацыі***
***Рэспублікі Беларусь***
***А.М. Радзькоў***

# Замкі Беларусі:
## сучаснае і будучае

***Дзве розныя па маштабе падзеі, што адбыліся ў Мінску на пачатку сакавіка, аб'яднаныя адной тэмай і датычацца захавання гістарычнай спадчыны нашай краіны – замкаў Беларусі.***

Па-першае, у галерэі фотаклуба «Мінск» адкрылася фотавыстаўка «Аб чым маўчаць муры...» Аляксандра Валадзько, фотакарэспандэнта газеты «Край Смалявіцкі».



*Гусар лятучы. Рэканструкцыя па гістарычным узоры XVII ст.*

Аб чым маўчаць рэшткі некалі, здавалася б, вечных палацаў і замкаў, якія ў рознай ступені захаваліся на тэрыторыі Беларусі? Розныя людзі адчуваюць маўчанне мураў па-свойму. Некаторыя адразу думаюць аб вялікіх таямніцах, якія захоўваюць гэтыя будынкі. Іншыя ўяўляюць сабе незлічоныя багацці ў сутарэннях. Камусьці мрояцца бітвы і перамогі, атрыманыя нашымі продкамі. І амаль усе ўяўляюць рамантычныя адносіны, што віравалі пад купаламі замкаў і палацаў, рыцарскія турніры і чароўных паннаў, за адзін позірк якіх маглі аддаць жыццё і нават пачаць вайну. Усе гэтыя адчуванні, безумоўна, панавалі і ў думках аўтара выстаўкі, бо без іх наўрад ці атрымалася б яна такой рамантычнай, прыгожай і далікатнай. У сваіх вандроўках па роднай зямлі аўтар выстаўкі наведвае гістарычныя месцы: Гальшаны, Ліду, Нясвіж, Мір, Косава, Ружаны і іншыя, дакранаецца душой да той спадчыны, якую пакінулі нашыя продкі, сустракаецца з людзьмі – і ўсё гэта фіксуе яго вечны спадарожнік – фотакамера, каб пакінуць уражанні на доўгія часы і даць магчымасць усім нам прыгадаць нашую гісторыю.

Другая (больш маштабная) падзея, што датычыцца будучыні замкаў, адбылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, дзе шырокаму колу гледачоў былі прадстаўленыя экспанаты, якія зоймуць свае месцы ў інтэр'ерах Замкавага комплексу «Мір».

На сённяшні дзень ад мінулага харства палацавага ўбрання нічога не захавалася, акрамя ўзораў кафлі XVI – пачатку XX стагоддзя, па якой была адноўленая печ у капліцы.

Для стварэння гістарычна дакладных інтэр'ераў Мірскага замка неабходныя як сапраўдныя экспанаты, так і рэканструкцыі твораў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, часта згубленых або якія захаваліся фрагментарна. Беларускія мастакі, спецыялісты ў розных галінах творчай дзейнасці звярнуліся да спадчыны майстроў, якія стваралі сапраўдныя шэдэўры для ўладальнікаў Мірскага замка: Іллінічаў, князёў Радзівілаў і Святаполк-Мірскіх.

На выстаўцы дэманструюцца рэканструкцыі рыцарскіх даспехаў, узораў магнацкага касцюма, фаянсу, керамічных вырабаў, габеленаў.

Рыцарскія даспехі, як і беларускі магнацкі строй, спецыялісты аднаўляюць па іканаграфічных крыніцах – партрэтах і гравюрах. Традыцыйны зварот шляхты да заходнееўрапейскай моды і ўзбраення дазваляе выкарыстоўваць у якасці ўзораў творы, якія захаваліся ў музеях Польшчы, Літвы, Чэхіі. Даспехі створаныя ў стылістыцы XVI–XVII стагоддзяў у творчай майстэрні «Стальная спадчына» знаўцамі сваёй справы В. Шаўцовым



*Аляксандр Валадзько*

і К. Дударавым, а таксама майстрам з Магілёва С. Нурматавым. У аснову рэканструкцыі гістарычных касцюмаў XVII–XVIII стагоддзяў, выкананых мастаком і мастацтвазнаўцам Юрыем Піскуном, пакладзенае карпатлівае вывучэнне партрэтнага жывапісу Беларусі і суседніх краінаў, гісторыі моды, вытворчасці і арнаментыкі італьянскіх, французскіх, іспанскіх тканінаў.

Узоры фаянсу, выробленыя мастаком А. Косткам,– гэта рэканструкцыі фаянсу Свержанскай мануфактуры, заснаванай у 1742 годзе князем Міхалам Казімірам Радзівілам у мястэчку Свержань (цяпер в. Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна). Захаваліся адзінкавыя творы, прадстаўленыя ў археалагічным музеі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вывучэннем якіх займаецца археолаг І. Ганецкая. Па гэтых узорах, а таксама архіўных дакументах, мастаку ўдалося стварыць максімальна дакладныя творы, выкананыя з захаваннем тэхналогіі старых майстроў. Падобна рэканструяваныя і керамічныя вырабы майстрам С. Молчанам, які шляхам дасканалага даследавання археалагічных знаходак перадаў у аналагічным матэрыяле найбольш распаўсюджаныя формы керамічных вырабаў XVI–XVIII стагоддзяў.

Габелены, якія зоймуць свае месцы ў апартаментнай частцы замка, выкананыя па эскізах творчай групы – У. Тоўсціка, В. Даўгалы і Г. Жарына. Гэта – «Зборы на паляванне» (2х6 м), «Паляванне» (2х2 м) і «Уладальнікі замка» (3х4,10 м). Падрабязнае вывучэнне стылістыкі старых габеленаў дазволіла мастакам максімальна перадаць вобразны лад і захаваць даўнія традыцыі ткацтва беларускіх габеленаў. Важную ролю адыграла ў гэтым і майстэрства унікальнага калектыву ткачых старэйшага ў Беларусі Барысаўскага камбіната дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва імя А. Кішчанкі.

У экспазіцыі выстаўкі таксама прадстаўленыя графічныя аркушы Я. Куліка з выявамі замкаў Беларусі і рамантычнымі замалёўкамі С. Верамейчыка, якія адлюстроўваюць розныя погляды беларускіх мастакоў на спосабы аднаўлення нацыянальнай гістарычнай спадчыны.

Адкрыццё выстаўкі суправаджалася выкананнем старажытнай музыкі і дэманстрацыяй магнацкіх строяў артыстамі ансамбля «Харошкі».

Прадстаўленыя ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі экспанаты будуць размешчаныя ў філіяле музея ў Замкавым комплексе «Мір» напрыканцы года.



***Наталі КУПРЭВІЧ***
***Фота аўтара***

# Пісьменніца са старажытнага Міра

*(Заканчэнне. Пачатак у № 14)*

У адным са сваіх інтэрв'ю Вольга Іпатава сказала: *«Тры жаночыя імені для мяне святыя: мама мая – Марыя, бабуля была адна Вольга, а другая Ефрасіння. Мяне назвалі ў гонар мамінай мамы, але імя Ефрасіння тым не менш засталося ўва мне і са мной як сакральнае. І першая мая празаічная рэч была прысвечаная якраз Ефрасінні Полацкай.*

*Так што імя Багародзіцы – Марыя, імёны дзвюх святых (Вольгі і Ефрасінні) усё жыццё пры мне. Яны – як тры жаночыя постаці нада мной. Над маім жыццём, над маім лёсам. Я іх заўсёды адчуваю».*

У 1975 годзе Вольга Іпатава паступіла ў аспірантуру Літаратурнага інстытута імя Максіма Горкага. У гэты час яе вершы і артыкулы друкаваліся на старонках маскоўскіх газетаў і часопісаў.

Пасля заканчэння аспірантуры пісьменніца працавала спачатку ў Тэатры юнага гледача загадчыцай літаратурнай часткі, а затым літкансультантам у газеце «Чырвоная змена». У беларускіх перыядычных выданнях яна друкавала свае вершы, апавяданні, артыкулы і рэцэнзіі на творы беларускіх пісьменнікаў, займалася перакладчыцкай дзейнасцю, шмат пісала для дзяцей. Вершы, паэмы, казкі для дзяцей увайшлі ў кнігі «Снягурка» (1974), «Казка пра Паўліна» (1983). Пісьменніца лічыць, што «казка – гэта нашая радавая повязь і сувязь з даўніной, з нашымі продкамі, без якой дзеці не могуць сябе адчуць нармальнымі, паўнацэннымі на гэтай зямлі».

Сын пісьменніцы абраў прафесію медыка, ён урач-онкагематолаг, стажыраваўся ў Германіі, абараніў доктарскую дысертацыю, разам з маці далучыўся да дапамогі хворым чарнобыльскім дзецям. Руслан добра валодае англійскай і нямецкай мовамі, піша артыкулы на беларускай мове, добра ведае гісторыю і літаратуру, іграе на піяніна, некалькі вершаў сваёй маці паклаў на музыку. У адным з сваіх вершаў Вольга Іпатава, якая вельмі ганарыцца сынам, напісала: *«Мой сын – мая найлепшая кар'ера».*

*«Цяпер, праз шмат гадоў,* – зазначыла пісьменніца, – *я наноў згаджаюся з тою даўняй высновай. Найбольшае пачуццё бязмернага шчасця, калі "такая кволая рука маленькай жанчыны, а вось змясціла адразу дзве ножкі ружовыя сына" або "я дзялюся з табою ўсёю палітраю свету" падарыў мне менавіта мой сын».*

Цягам 1970–1980-х гадоў выйшлі кнігі прозы В. Іпатавай «Вецер над стромай» (1977), «Дзвацать хвілін з Немізідай» (1981), «Перакат» (1984), «Узелок Святогора» (на рускай мове, 1986), якія атрымалі высокую ацэнку крытыкі. Некаторыя апавяданні былі перакладзеныя на балгарскую, нямецкую і польскую мовы. У прадмове да зборніка «Ветер над кручей» (на рускай мове, 1980) Васіль Быкаў, адзначыўшы тэматычную разнастайнасць, драматызм, псіхалагізм, моўнае багацце твораў Вольгі Іпатавай, назваў яе прыродным празаікам. За гэтую кнігу ў 1981 годзе аўтар узнагароджаны першай прэміяй усесаюзнага літаратурнага конкурсу імя Максіма Горкага.



*Яшчэ адно захапленне – гітара*

У 1985 годзе Вольга Іпатава пачала працаваць галоўным рэдактарам рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм беларускага тэлебачання. Перадача «Ліра», дзе яна была вядучай, стала надзвычай папулярнай, а газета «Чырвоная змена» ў 1989 годзе назвала яе лепшай вядучай года. Нашая зямлячка адкрывала тэлегледачу малавядомыя старонкі беларускай гісторыі і забытыя імёны Бацькаўшчыны, цікава распавядала пра беларускіх асветнікаў і мецэнатаў, пра архітэктурныя помнікі Беларусі і старажытныя кнігі, пра цудатворныя абразы і беларускіх святых, знаёміла з важнымі падзеямі ў жыцці Беларусі.

Вольга Іпатава працягвала весці тэлеперадачы і тады, калі працавала ўжо намеснікам галоўнага рэдактара ў часопісе «Спадчына», які адкрываў чытачу раней забароненыя імёны славутых беларусаў. Яна стварыла цыкл дакументальных фільмаў пра беларусаў далёкага замежжа, дапамагала вяртаць іх творчую спадчыну на радзіму.

У 1991 годзе пісьменніца стала галоўным рэдактарам газеты «Культура» і працягвала высакародную асветніцкую справу, імкнучыся праўдзіва расказваць пра беларускую гісторыю і культурныя традыцыі Бацькаўшчыны.

У 1998 годзе Вольга Іпатава была абраная намеснікам, а пазней старшынёй Беларускага саюза пісьменнікаў, што паспрыяла яшчэ больш актыўнай грамадскай дзейнасці пісьменніцы, яе шматлікім сустрэчам з чытачамі, вандроўкам па розных краінах свету. Але галоўнай для пісьменніцы заўсёды заставалася творчасць. Менавіта з 1997 па 2001 гады з'явіліся гістарычныя раманы Вольгі Іпатавай, прысвечаныя станаўленню Вялікага Княства Літоўскага, – «Залатая жрыца Ашвінаў», «Вяшчун Гедзіміна», «Альгердава дзіда», якія, як адзначыў У. Конан, «склалі першую ў нашай гістарычнай літаратуры, значную для нацыянальнай культуры па сваёй маштабнасці і мастацкай вартасці трылогію».

Цікавыя гістарычныя нарысы пра беларускія гарады змешчаныя ў кнізе нашай таленавітай зямлячкі «Паміж Масквой і Варшавай» (некалькі гістарычных маршрутаў Беларусі), выдадзенай у 1996 годзе на беларускай і нямецкай мовах. Пісьменніца не абмінула ўвагай свой родны куток, змясціўшы гістарычныя звесткі пра Мір і Карэлічы. У прадмове да кнігі Вольга Іпатава напісала: *«Дасюль Беларусь у свеце калі і ведалі, то ў асноўным як партызанскую рэспубліку, але тысячагадовай яе гісторыі нібыта і не існавала. Вось чаму, адклаўшы ўсе справы, аўтар узялася хацця б вельмі сцісла расказаць пра некаторыя нашы гарады з іх даўняй цікавай гісторыяй, аднавіць вобразы славутых людзей нашай зямлі, звязаныя з тымі ці іншымі мясцінамі, апісаць найбольш самабытныя этнаграфічныя абрады – словам, накідаць партрэт той Беларусі, пра якую самі беларусы ведаюць яшчэ зусім мала, але якою можна ганарыцца любому народу».*

Гісторыя Беларусі знайшла адлюстраванне і ў спектаклі «Давыд Гарадзенскі», пастаўленым на тэлебачанні паводле сцэнарыя Вольгі Іпатавай, і ў оперы А. Бандарэнкі «Князь Наваградскі», лібрэта да якой напісала пісьменніца. Партыю князя Рамана ў оперы з поспехам выканаў яе зямляк з вёскі Турэц, саліст Нацыянальнай оперы Аляксандр Кеда.

У 1995 годзе Вольга Іпатава абраная Ганаровым акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, якая аб'ядноўвае вучоных і грамадскіх дзеячаў больш чым з 30 краінаў свету. Яе імя ўключанае ў IX выданне даведніка «Хто ёсць хто сярод прафесіяналаў і дзелавых жанчын у свеце». Пісьменніца выступала на шматлікіх міжнародных навуковых канферэнцыях, чытала лекцыі па беларускай міфалогіі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце і Беларускім універсітэце культуры. Творы пісьменніцы перакладзеныя на многія мовы.

Вольга Іпатава, якая лічыць, што апраўдацца перад Богам пісьменнік можа толькі творчасцю, заўсёды годна выконвала місію гістарычнага асветніцтва народа. *«Калі ты прыйшоў на гэту зямлю, рабі тую працу, якую табе прапануе жыццё. Кім бы ты не працаваў – пісьменнікам ці дворнікам. У кожнага ёсць залаты Боскі запас – яго сэрца, розум, душа. Выкарыстай іх для людзей...»,* – гаворыць пісьменніца.

*Услед пайсці за бліскавіцай,*
*На ўсё забыцца, акрамя*
*Вады з бабулінай крыніцы,*
*Свайго уласнага імя...*

**Святлана КОШУР,**
**старшы навуковы супрацоўнік**
**Карэліцкага раённага**
**краязнаўчага музея**

## Наш каляндар



**14 красавіка 1880 года** ў Слуцку ў сям'і службоўца нарадзіўся **Язэп (Восіп Лявонавіч) ДЫЛА** – беларускі празаік, драматург, грамадскі дзеяч. У 1890–1898 гадах вучыўся ў Слуцкай гімназіі, з 1899 года – у Юр'еўскім (Тартускім) ветэрынарным інстытуце, з якога ў 1903-м быў выключаны за ўдзел у студэнцкіх антыўрадавых выступленнях без права паступлення ў іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. У 1903–1904 гадах працаваў супрацоўнікам мінскай газеты «Северо-Западный край», а ў 1905-м вёў нелегальную працу сярод сялянаў.

У 1906–1918 гадах працаваў у выдавецтвах Пецярбурга, Арэнбурга, Казані і Масквы, быў асабіста знаёмы з А. Купрыным, Л. Андрэевым, М. Арцыбашавым ды іншымі рускімі пісьменнікамі. Са снежня 1918-га па люты 1919 года працаваў наркамам працы ў Часовым рабоча-сялянскім Савецкім урадзе Беларусі. У 1918-м у газеце «Дзянніца» надрукаваў шэраг артыкулаў, у якіх расказваў пра беларускае грамадска-культурнае жыццё ў Маскве і вітаў усталяванне савецкай улады.

У 1921–1924 гадах займаў розныя кіруючыя пасады: старшыня Цэнтрасаюза, старшыня Дзяржаўнай планавай камісіі БССР, намеснік старшыні па раянаванні БССР. Нядоўгі час папрацаваў у толькі створаным Інстытуце беларускай культуры. Разам з прафесарам У. Пічэтам і акадэмікам Я. Карскім распрацоўваў статут Інбелкульта, з'яўляўся праўдзейным членам гэтай установы. У красавіку 1925 года быў прызначаны дырэктарам БДТ-1 (цяперашняга Беларускага тэатра імя Янкі Купалы). З кастрычніка 1926-га па 1928 год ізноў працаваў у Інбелкульце – вучоным сакратаром, а таксама загадчыкам секцыі па вывучэнні беларускага мастацтва. Больш за паўгода загадваў літаратурна-мастацкімі справамі ў Белдзяржкіно, а з красавіка 1929 года быў інспектарам Галоўмастацтва Наркамасветы.

Беспадстаўна арыштаваны 6 жніўня 1930 года і асуджаны на 5 гадоў з высылкай на Урал у горад Кунгур. Пасля некаторы час жыў у Яраслаўлі і Саратаве. У жніўні 1938 года зноў арыштаваны, а праз паўгода вызвалены.

Рэабілітаваны 15 лістапада 1957 года. Памёр 7 красавіка 1973 года ў Саратаве.

Першая публікацыя была ў «Нашай Ніве» напрыканцы 1909 года – абразок «Перад раніцаю...». Праз тры гады тамсама друкуе верш «Вечар ясны, ціхі ...». Ён аўтар шэрагу публіцыстычных артыкулаў, п'есаў («Панскі гайдук», «Падуанскі студэнт», «Юнак з Крошына»), аповесці «У імя дзяцей», а таксама няскончанага рамана «На шляху з варагаў у грэкі», успамінаў пра Янку Купалу, Якуба Коласа і Яна Райніса, працаў, прысвечаных тэатральнаму жыццю Беларусі і гісторыі кнігі. Пакінуў таксама пераклады вершаў М. Канапніцкай на беларускую мову.




# Споведзь беларуса,
## або «Радавод» Мікалая Мельнікава

Мне, прадстаўніку сучаснага пакалення, пра змрочныя падзеі калектывізацыі вядома толькі з падручнікаў па гісторыі Беларусі. Прызнаюся, прыняць тыя падзеі блізка да сэрца ў мяне не выпадала – агульная гісторыя. Тлумачыцца гэта, пэўна, тым, што не даецца поўная інфармацыя, нешта абыходзіцца, штосьці замоўчваецца. Але не трэба адварочвацца ад мінулага. Хтосьці трапна сказаў, што калі цяперашняе стрэліць у мінуўшчыну, то кулю можа атрымаць твая будучыня. Ды збегчы ад сваёй даўніны яшчэ нікому не ўдавалася... Асабістае мінулае – твой род, твае карані, твае продкі, твая кроў, твой свет, твае крокі...

Нядаўна пазнаёміўся з былым дацэнтам, загадчыкам кафедры рускай і замежнай літаратуры Гродзенскага універсітэта, сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў Мікалаем Мельнікавым. Ён падпісаў мне сваю чарговую кнігу – «Радавод» – хроніку жыцця беларускай сялянскай сям'і.

Уступам хронікі стаў патрыятычна-рэвалюцыйны верш «Братам у няволі» пакутнай паэткі, змагаркі і эмігранткі Ларысы Геніюш, напісаны ў 1949 годзе ў працоўным лагеры ў Комі АССР.

Па аб'ёме кніга невялікая, з простымі аповедамі, але пранізаная болем і горыччу, якія адчуваюцца пад час прачытання. А што казаць, калі праз гэтыя жыццёвыя нягоды прайшоў сам аўтар і ягоны род. Гэта не проста кніга – гэта споведзь, глыбокая адданасць беларускаму народу.

Мікалай Аляксандравіч знаёміць чытача са сваім родам працавітых сялянаў, жыхароў вёскі Брады Чавускага раёна. Аўтар яскрава перадае падзеі калектывізацыі, якая знішчала сем'і, даводзячы іх не толькі да раскулачвання, але і да галечы. Маленькі Міколка стаў сведкам суровых падзеяў. У сям'і раскулачанага Восіпа Кірэевіча Мельнікава, як пазначана ў дакументах, было 5 працаздольных чалавек і 11 на ўтрыманні. Уся сям'я займалася земляробствам, мела багата зямлі і жывёлаў. Але ж бязлітасныя парадкі знішчылі ўсё нажытае, прымусіўшы нявінных людзей пакутаваць у ссылцы ў Сібіры. Зламаць лёсы людзей подлым кіраўнікам удалося, але ж не змаглі выкараніць у іх пачуццё нацыянальнай годнасці. Колькі здзекаў зведаў не толькі сам дзед Восіп, але і яго дзеці Аляксандр, Максім, Віктар, Еўдакія! Не абышлі нягоды і ўнукаў – Міколку, Валодзю, Марыю. А плач, невыноснае галашэнне бабулі Марыі Герасімаўны – настойлівы пратэст супраць сацыяльнай несправядлівасці. Усё гэта да сённяшняга дня трымаецца глыбока ў душы колішняга Міколкі – Мікалая Аляксандравіча.

Сям'я Мельнікавых – узор сялянскага беларускага роду, стойкага, незламанага роду зберагальнікаў народных традыцый і абрадаў...

«Радавод» – трэцяя кніжка трылогіі ўспамінаў. Папярэднімі былі «Адчай, боль і горыч» і «Вяртайцеся, буслы!». Пра гэтыя кнігі гродзенская пісьменніца Данута Бічэль сказала: «Ва ўспамінах многа болю, які кранае. Многа праўды, уся балесная праўда. Многа ціхай, але загоенай часам, утаймаванай крыўды на людзей, якія прыйшлі ў наша жыццё як подлыя заваёўнікі, называючы сябе "вызваліцелямі", і стапталі, знявечылі лёсы людзей, якіх тут Бог пасяліў і вызначыў ім людскую долю». Сам аўтар трылогіі прызнаецца: «Я тут падзяліўся з вамі, сучаснікамі, пра жудаснае мінулае маё і маіх сваякоў не толькі дзеля ўспамінаў і плачу, а каб раскрыць вам, маладому пакаленню, сучаснікам і ўсім, хто возьме ў рукі гэтую кніжку, як урок, як наказ нашым нашчадкам, каб больш такое ніколі ў нас не паўтарылася, не дапусцілася...»




Перажыць такое змрочнае наканаванне пад сілу толькі моцным беларусам, якія сцiснуўшы зубы ад болю здольныя выканаць сваю справу дзеля захавання беларускага роду. Нездарма Мікалай Аляксандравіч з'яўляецца кіраўніком гродзенскага музея вялікага беларускага пісьменніка, чалавека праўды – Васіля Быкава.

*Алесь ХІТРУН,*
*студэнт філфака*
*Гродзенскага дзяржаўнага*
*універсітэта*
*імя Янкі Купалы*

# Волат сусветнай астранаўтыкі, сын зямлі нашай

Вечарына, прысвечаная 100-гадоваму юбілею знанага беларуса Барыса Уладзіміравіча Кіта, прайшла 6 красавіка ў зале Палаца мастацтва. Сышлося многа людзей і памяшканне не ўмясціла ўсіх, хто імкнуўся калі не сказаць добрае слова аб гэтым чалавеку, дык хаця паслухаць, што скажуць іншыя, засведчыць сваё шаноўнае стаўленне да беларускага волата ў галіне сусветнай астранаўтыкі. Так сапраўды было.

Але... Напярэдадні ў ліфце дома, дзе я жыву, сустрэў суседа па пад'ездзе – чалавека інтэлігентнага, па-сапраўднаму адукаванага аж у дзвюх вышэйшых установах, чалавека, які выпісвае шмат дзяржаўных перыядычных выданняў. Ён у мяне пытае, ці сустракаў я дзе-небудзь такое прозвішча – Кіт... Гэта ж трэба, маўляў, такі чалавечына жыве на свеце, а я нічога пра яго не ведаў.

– І не дзіва, – кажу яму, – я таксама пра нашага слыннага беларуса даведаўся не так даўно, усяго гадоў 17 таму. Мо, таму не чулі пра яго, што чытаеце выключна дзяржаўную прэсу? А яна і сама была, так бы мовіць, «не в курсе». Тэма беларусаў у свеце, скажам шчыра, калі не ў забароне, то і не ў пашане ў нашых ідэалагічных службаў.

Каб вы, шаноўны чытач, бачылі, якімі здзіўленымі, недаверлівымі вачыма глядзеў гэты чалавек на мяне, калі я пачаў пералічваць беларускія роды мінуўшчыны, ад якіх мы самі адмовіліся гістарычна, – Дамейкаў, Ходзькаў, Мінейкаў, Агінскіх, Манюшкаў, Кавалеўскіх, Стравінскіх, Глінкаў, Малевічаў ды іншых.

Разам са здзіўленнем у вачах майго суразмоўцы з'явіўся недавер, а ў галасе – пэўная насцярога, быццам я хацеў забраць у яго нешта такое блізкае, роднае – ягоныя веру, упэўненасць у іншае. А ўпэўненасць у гэтага адукаванага двума інстытутамі чалавека была адна: сусветныя знакамітасці маглі нараджацца толькі ў іншых краях, асабліва шмат у Расіі. І проста іх не павінна было быць у «лапатнай Беларусі».

На жаль, такіх інтэлігентаў у нас яшчэ хапае, а мо іх большасць.

Вось з такімі думкамі я і пайшоў на вечарыну, прысвечаную 100-гадовай даце славутага Барыса Кіта. І гэта добра, што пайшоў. Там я сустрэў тых, хто ведае значна больш знакамітых родаў Беларусі, якія ўславілі яе за мяжою. Са словамі пра Барыса Уладзіміравіча выступілі пісьменнікі Васіль Якавенка, Уладзімір Арлоў, Сяргей Законнікаў, акадэмік Радзім Гарэцкі, старшыня клуба «Спадчына» Анатоль Белы, падзяліліся ўспамінамі аб сустрэчах з Б. Кітом Станіслаў Шушкевіч, Іосіф Сярэдзіч, Тамара Вяршыцкая ды іншыя.

Досыць нечаканым для прысутных стаў удзел у вечарыне і выступленне брата юбіляра Льва Уладзіміравіча Кіта, які жыве ў Мінску.

Прысутныя накіравалі ў Германію, дзе цяпер жыве Б.У. Кіт, словы прывітання, шчырыя віншаванні, узнагароды з нагоды юбілею і, галоўнае, пажаданні добрага здароўя на гады і надзею ўбачыць яго на зямлі роднай Бацькаўшчыны.

***Уладзімір ГІЛЕП***

# Беларуская сцежка ў космас

***Гэта пачэсная справа – напамінаць беларусам аб беларусах. Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча перыядычна арганізоўвае мерапрыемствы, прысвечаныя слынным людзям нашай зямлі. З гэтага ж раду і вечарына ўшанавання да стагоддзя Барыса Кіта.***

...Спачатку пра галоўнага героя мерапрыемства. Шырокай грамадскасці добра вядомыя імёны беларускіх касманаўтаў Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка. Радзей згадваецца яшчэ адзін беларускі «касмічны чалавек» – Барыс Кіт.

Барыс Уладзіміравіч Кіт – дзеяч беларускай эміграцыі, амерыканскі вучоны. Нарадзіўся 6 красавіка 1910 года ў Санкт-Пецярбургу. Радавое дрэва паходзіць з невялічкай вёскі Агароднікі, што на Карэліччыне. Скончыў Навагрудскую беларускую гімназію (1928), фізіка-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта (1933). Працаваў настаўнікам, дырэктарам Віленскай і Навагрудскай беларускіх гімназій. Доктар філасофіі ў галіне матэматыкі і гісторыі навукі (1982), акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі ў Парыжы (1991). З 1948-га ў ЗША, дзе заснаваў беларускую калонію ў Саўт-Рыверы (штат Нью-Джэрсі) – самую вялікую ў ЗША на сённяшні дзень. Удзельнічаў у распрацоўцы амерыканскіх касмічных праектаў на працягу 25 гадоў (сярод іншага даследаваў магчымасці вадкага вадароду як ракетнага паліва, што цяпер стандартна выкарыстоўваецца для палётаў касмічных караблёў). Адначасова выкладаў у Мэрылендскім універсітэце. З 1972 года ў Германіі, выкладаў у Гайдэльбергскім універсітэце, філіяле Мэрылендскага універсітэта ў г. Вісбадэн. Аўтар навуковых працаў па праблемах астранаўтыкі. Удзельнічаў у першых перамовах паміж ЗША і СССР па супрацоўніцтве ў галіне касманаўтыкі.

...Слова перад прысутнымі (якія, дарэчы, запоўнілі ўсю залу) трымаў вучань Барыса Кіта па Гандлёва-адміністрацыйнай школе, вядомы жывапісец, сябра Саюза мастакоў Беларусі Кастусь Харашэвіч. Дзейнасці Барыса Кіта прысвяціў сваё выступленне і Барыс Бароўскі, кандыдат хімічных навук, навуковы супрацоўнік Маладзечанскага краязнаўчага музея. Вялі праграму супрацоўнікі бібліятэкі Марыя Ляцяга, Ганна Незнаева, Наталля Фандорка.

...Усё жыццё Барыс Кіт імкнуўся як мага больш зрабіць для Беларусі і беларусаў, але большую яго частку пражыў за межамі блакітнавокай. Як напісаў яго былы вучань па Навагрудскай беларускай гімназіі, паэт Самсон Пярловіч:

*Хоць і жывеш ты на выгодзе,*
*Балюча сэрца твае ные,*
*Бо там, дзе ездзіш ты, дзе ходзіш,*
*Дарогі-сцежкі ўсе чужыя.*
*Глядзіш са смуткам, як да гнёздаў*
*З нябёсаў птушкі ўсе імкнуцца.*
*І прагне сэрца назаўсёды*
*На Бацькаўшчыне апынуцца.*

***Сяргей ЦІМОШКА***

# Востраў Шацілінскі і Светлая гара

***Я імкнуся болей даведвацца пра мой родны горад Светлагорск. Ён вельмі чысты і ўтульны, ад яго сыходзіць святло. Мне было прыемна, што з'явілася магчымасць сумясціць маю цікавасць з конкурсам «Мая малая Радзіма», што праходзіў у нашым каледжы. Працуючы, сутыкнулася з многімі цяжкасцямі. Але было так цікава, што мяне нічога не магло спыніць.***

Светлагорск вельмі малады горад, таму я пачала з пошукаў інфармацыі пра востраў Шацілінскі, дзе і быў заснаваны мой горад. Але акрамя кнігі «Памяць» шукаць не было дзе. Таму вырашыла паспрабаваць патрапіць у Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. І ў мяне атрымалася. Дадам толькі: тое, што я там бачыла, нельга перадаць словамі. Многія ходзяць па музеях, каб паглядзець на такія кнігі, якія я трымала ў руках. А яшчэ мне пашчасціла размаўляць з вельмі цікавымі людзьмі, напрыклад, з светлагорскім журналістам Віктарам Рамановым, які мне дапамог інфармацыяй.

Раней я заўсёды лічыла, што майму гораду менш за паўсотні гадоў, і на гэтым – кропка. Але на самой справе, паводле адных крыніцаў, першыя згадкі пра паселішча, якое было на гэтым месцы, адносяцца да 1560 года, а паводле іншых – да 1199-га. Такім чынам, Светлагорская зямля тоіць у сабе шмат загадак.

Шацілавічы, Шацілкі, Востраў Шацілінскі – у розныя часы па-рознаму звалася вёсачка, размешчаная ўздоўж Бярэзіны, акружаная сцяной густога лесу.

А назву «Светлагорск» нашаму гораду далі людзі, якія на пачатку 1960-х з'ехаліся ў вёску Шацілкі на заклік тагачасных партыі і камсамола будаваць электрастанцыю. У новую назву яны ўклалі просты сэнс: Светлагорск літаральна азначае «Светлая гара».

Але ёсць свая гісторыя і ў вёскі Шацілкі. Існуе некалькі версіяў паходжання назвы. Адна з іх – ад слова «шаты»: прыгожая і дарагая апратка, якую насілі ў святочныя дні нашыя продкі. Нібы гэтае рамяство і надавала вяскоўцам шырокую вядомасць. З усіх навакольных вёсак ехалі сюды па шаты, набывалі ўборы і падарожнікі. Іншая версія кажа, што назва мае корань «шацъ» – месца, якое пазарастала чаротам.

А яшчэ існуе легенда: даўным-даўно ўздоўж Бярэзіны цягнуліся сем шукальнікаў шчасця. Убачылі яны на правым беразе ракі прыгожае месца і пасяліліся там. Сярод іх быў чалавек па прозвішчы Шаціла, у якога расла нябачнай прыгажосці дачка. Яна любіла хадзіць па беразе паўнаводнай ракі. І аднойчы пад час абвалу стромкага берага дзяўчына зваліласяў цёмны вір Бярэзіны. Задушаны страшнай трагедыяй Шаціла пакінуў нешчаслівае месца. А селішча з таго часу стала звацца Шацілавічы.

Цяпер прапаную завітаць у Музей гісторыі горада Светлагорска, які быў адкрыты 30 снежня 1978 года на грамадскіх пачатках як краязнаўчы, а з лістапада 1979 года стаў музеем гісторыі горада. Ён мае 5 экспазіцыйных залаў, у фондах захоўваецца больш за 8 тысячаў музейных прадметаў. Першая зала адведзеная прыродзе і яе ахове. Тут можна ўбачыць косткі маманта, узоры карысных выкапняў, якія здабываюць у раёне. Зала археалогіі расказвае пра горад Казімір, які, паводле даследаванняў вучоных, існаваў непадалёк на пачатку XVII стагоддзя. Раскопкі праводзіліся каля вёскі Чырвоная Слабада. Апроч прыладаў працы ды цікавых рэчаў хатняга побыту было знойдзенае дрэва ілым. У музеі ёсць выява гэтага цуда. Трэцяя зала расказвае пра гісторыю Вострава Шацілінскага, ёсць тут і ягоная рэканструкцыя. У наступнай зале прадстаўленыя рэчы хатняга побыту і традыцыйнае адзенне...

Таксама мы можам наведаць Светлагорскую карцінную галерэю «Традыцыя» імя Германа Пранішнікава, якая ўпершыню адчыніла свае дзверы 19 верасня 1992 года.

Паколькі наш горад малады, то на свае вочы мы бачым, як будуюцца і адкрываюцца новыя храмы. Так, 6 верасня 1997 года ў Светлагорску адбылося ўрачыстае адкрыццё новапабудаванага касцёла. А ў нядзелю 17 верасня 2006 года пад час святкавання дня горада быў урачыста адкрыты Свята-Праабражэнскі сабор. Для асвячэння храма Светлагорск наведалі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх, прадстаўнікі духавенства.



Шацілінскі касцёл

***Праведзенае даследаванне дапамагло мне спазнаць невядомае і ўпэўніцца: кожны можа паспрабаваць сілы і даведацца пра гісторыю роднага куточка. Гэта не толькі цікава, але і актуальна – на шчасце, у краіне расце цікавасць да мінуўшчыны.***

***Вольга ГАМАНКОВА,*** *навучэнка Лінгва-гуманітарнага каледжа Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта*



Свята-Праабражэнскі сабор



Музей гісторыі горада

# Таямніцы і рэдкія кнігі

Дом Урада, які знаходзіцца на галоўнай плошчы сталіцы, вядомы ці не кожнаму жыхару нашай краіны. У будынку – галоўныя органы кіравання, Урад Беларусі і парламент нашай дзяржавы. А яшчэ – Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, якая ўмяшчае ў сваіх сховішчах кнігі, часопісы, газеты. Ёсць тут і чытальная зала, а таксама аддзел старадрукаў і рэдкіх выданняў, што, безумоўна, прыцягвае ўвагу самых патрабавальных чытачоў. Канечне ж, працуюць у калектыве Прэзідэнцкай бібліятэкі людзі апантаныя, улюбёныя ў кнігу. Адзін з іх – сапраўдны мэтр сваёй справы Валерый Мікалаевіч Герасімаў, з якім мне даўно хацелася пазнаёміцца.

На пачатку нашага знаёмства вядомы кнігазнаўца заўважыў: «Бібліятэка – гэта тое святое месца, дзе ўтрымліваюцца сапраўдныя кніжныя скарбы». А яшчэ, дадаў спадар Герасімаў, – і прастора, у якой блукаюць... розныя прывіды. Вось пра адзін з іх і расказаў мне Валерый Мікалаевіч: «Некалі ў Доме Урада працаваў старшыня ЦВК БССР Аляксандр Чарвякоў. У адзін з дзён ён прыйшоў на працу рана, каля 6 гадзінаў, каб паназіраць з балкона левага крыла Дома Урада, як зносяць праваслаўную царкву, што тады стаяла на цяперашняй плошчы Мяснікова. І пасля такога страшэннага, дзікунскага відовішча вярнуўся да сябе ў кабінет і застрэліўся. Прама на рабочым месцы... А цяпер дух Чарвякова, не маючы спакою, жыве ў цёмных падвалах нашага будынка і пужае людзей, якія па нейкіх прычынах запазніліся на працы». А яшчэ, перакананы спадар Герасімаў, знаходзяцца тут рэшткі помніка Сталіну, што некалі стаяў на плошчы перад Домам Урада...



В. Герасімаў падчас аблічбоўкі старадрукаў

У Прэзідэнцкай бібліятэцы знаходзіцца нямала старых кніг. Самыя старажытныя – «Навуковы трактат» (1594), «Служебник» (Масква, 1602), «Тридион» (1618)...

– «Тридион», – заўважае Валерый Мікалаевіч, – з кніг, якімі мы асабліва ганарымся. Ведаю, што гэта адзін з нямногіх экземпляраў на постсавецкай прасторы. Выдадзеная царкоўна-славянскай моваю, кніга з'яўляецца цікавай крыніцай па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, дапамагае ўявіць тыя часы, да якіх адносіцца яе выданне...

Ганарацца ў бібліятэцы адзіным прыжыццёвым паэтычным зборнікам Максіма Багдановіча «Вянок» (1913), «Гісторыяй беларускай (крыўскай) кнігі» Вацлава Ластоўскага. З выдання апошняй яшчэ не мінула і ста гадоў, а яна ўжо ўспрымаецца як сапраўдны рарытэт. Мне паказваюць у Прэзідэнцкай бібліятэцы «Беларускі архіў старажытных грамат» (1824), памятныя кніжкі беларускіх губерняў... Уражанне такое, быццам у падарожжа ў мінуўшчыну выпраўляешся!

– Важнае месца ў нашых фондах, – працягвае расповед Валерый Мікалаевіч, – займаюць камплекты першых беларускіх газетаў і часопісаў «Наша доля», «Наша Ніва» (1906–1915), «Дзянніца», расійскі часопіс «Современник». Ёсць і рэдкі для беларускіх бібліятэк «Крывіч», што выдаваўся ў 1923–1927 гадах. Часта нашыя чытачы звяртаюцца да кнігі «Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой», выдадзенай у 1888 годзе. А сапраўднай пярлінай у нашых зборах з'яўляюцца кірылічныя старадрукі. Іх усяго некалькі. Асноўная частка гэтай калекцыі была перададзеная Нацыянальнай бібліятэцы...

Яшчэ бібліятэка мае шмат мініяцюрных выданняў – так званых кніг-малютак. Ёсць і кнігі з вядомых і славутых бібліятэк Радзівілаў, Супрасльскага манастыра, Рускай Тургенеўскай бібліятэкі ў Парыжы. Асобна вылучаныя рарытэтныя выданні з кнігазбораў Баркалабаўскага і Талачынскага манастыроў, з Беларускага музея і бібліятэкі Івана Луцкевіча ў Вільні. Менавіта гэтыя здабыткі, што фармавалі фонды на працягу многіх дзесяцігоддзяў, і ўпрыгожваюць бібліятэку, робяць яе прывабнай для многіх чытачоў.

***Дар'я ШОЦІК***

# Праўда пра штрафбат

***І ў дзяцінстве, і ў юнацтве, памятаю, зачытваўся кнігай успамінаў Героя Савецкага Саюза Г. Лінькова «Война в тылу врага». І доўга не мог зразумець, чым яна мяне прыцягвае. А палюбілася яна тым, што напісаная праўдзіва, падзеі паказаныя без пафасу, рэальна. Менавіта такія ж пачуцці выклікае і кніга ўспамінаў удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Аляксандра Пыльцына «Страницы истории 8-го штрафного батальона Первого Белорусского фронта».***

Кніга напісаная вельмі цікава, жывой, вобразнай моваю. Аповед захоплівае чытача. А самае каштоўнае ў ім – праўда жыцця. Аўтар прайшоў вялікую і складаную жыццёвую школу, ва ўспамінах-развагах не крывіць душою, расказвае шчыра, з любоўю да сваіх саслужыўцаў-падначаленых, да ўсіх добрых людзей, з якімі звёў лёс. Як піша сам Аляксандр Пыльцын, сваю частку Вялікай Айчыннай вайны да самай Перамогі ён прайшоў камандзірам узвода і роты ў 8-м афіцэрскім штрафным батальёне 1-га Беларускага фронту. І самыя незабыўныя ўражанні і пра афіцэрскія штрафбаты, і пра беларусаў, і пра Беларусь атрымаў у баях пад Жлобінам і за вызваленне Рагачова. А батальёнам, у якім ваяваў аўтар кнігі, камандаваў ураджэнец Рагачоўшчыны, чалавек рэдкага воінскага майстэрства і камандзірскага таленту Аркадзь Аляксандравіч Осіпаў.

«Галоўная мая мэта, падкрэслівае аўтар, – праз людзей, з якімі мяне сутыкалі абставіны, праз падзеі, якімі запаўнялася жыццё, паказаць не толькі штрафбат на вайне, але і той няпросты, сапраўды гераічны час. Тую эпоху, якая засталася цяпер толькі ў памяці прадстаўнікоў пакалення, якое ўжо, на жаль, сыходзіць, пакалення пераможцаў, і пра якую трэба ведаць тым, хто прыходзіць на змену».

Трэба адзначыць, што ў кнізе няма ні адной прыдуманай падзеі ці баявога эпізода, ні аднаго нерэальнага персанажа. Сапраўднасць падзеяў, якія адбываліся ў 8-м асобным штрафным (афіцэрскім) батальёне, падмацаваная Цэнтральным архівам Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (г. Падольск), таму кнігу з поўным правам можна назваць гісторыка-дакументальнай.

Аўтар кнігі генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр Васільевіч Пыльцын пакрочыў у Вялікую Айчынную літаральна з выпускнога балю сярэдняй школы. Пасля заканчэння Ваенна-пяхотнага вучылішча быў прызначаны камандзірам стралковага ўзвода, а затым роты аўтаматчыкаў афіцэрскага штрафнога батальёна 1-га Беларускага фронту. Нягледзячы на неаднаразовыя раненні заставаўся са штрафнікамі да самай Перамогі. Пасля заканчэння вайны працягваў службу ва Узброеных Сілах, аддаў службе сорак гадоў. Узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі. Выбраны сапраўдным членам Акадэміі праблемаў бяспекі, абароны і правапарадку Расійскай Федэрацыі. Жыве ў Санкт-Пецярбургу.

Аляксандр Пыльцын акцэнтуе ўвагу на тым, што франтавыя афіцэрскія штрафбаты і армейскія штрафныя роты ў нейкай ступені аб'ядноўвае толькі паняцце «штрафныя» ды яшчэ складаныя баявыя задачы, якія ім прыходзілася вырашаць. Штрафбаты і штрафныя роты былі зусім рознымі воінскімі арганізацыямі. Штрафбаты складаліся толькі з афіцэраў, якія праштрафіліся (здзейснілі парушэнні дысцыпліны). Неафіцэрскіх штрафбатаў проста не было! Штрафныя ж роты камплектаваліся радавымі і сяржантамі, якія праявілі баязлівасць і панікёрства ў баі, сталі дэзерцірамі або здзейснілі іншыя злачынствы. Менавіта ў іх накіроўваліся і крымінальныя элементы, этапіруемыя на фронт з месцаў зняволення. Але гэта былі толькі тыя зняволеныя, хто сам дабіваўся замены тэрмінаў няволі, якія яшчэ заставаліся, адпраўкай на перадавую, і тое толькі пасля сур'ёзнай праверкі.

Аб асаблівасцях выкарыстання ў баях менавіта афіцэрскіх штрафных батальёнаў і аб тым, што давялося перажыць за час знаходжання ў такім штрафбаце, аўтар і расказвае ў кнізе. Падрабязна апісвае ўдзел у рагачоўска-жлобінскай наступальнай аперацыі, у аперацыі «Баграціён», бітве за Брэст, у вызваленні Польшчы, фарсіраванні Одэра, узяцці Берліна. Дысцыпліна ў батальёне была жалезная. Як і ўсе франтавыя часці, байцы былі добра ўзброеныя, выдатна абмундзіраваныя. Тых, хто атрымаў раненне, нават нязначнае, або здзейсніў гераічны ўчынак, без прамаруджвання адпраўлялі ў тыл. Тут жа з'яўляўся і загад аб рэабілітацыі штрафніка: ён узнаўляўся ў ранейшым званні, а калі вызначыўся ў баі, узнагароджваўся і пасля выздараўлення накіроўваўся на фронт у звычайную часць.

Мемуары А. Пыльцына вызначаюцца сумленнасцю, праўдзівасцю, якія выяўляюцца ў дэталях, прыватнасцях, а не ў дэкларацыях і агульных разважаннях. Што характэрна: на долю аўтара выпала нямала выпрабаванняў, але ён здолеў захаваць пачуццё гумару і лірызм, якім прасякнутая кніга. А кніга гэтая – яшчэ адна крыніца праўдзівага асвятлення малавядомых фактаў мінулай вайны. Па словах класіка савецкай ваеннай прозы Юрыя Бондарава, гэта не проста матэрыял, а дакумент.

*Міхась **КАВАЛЁЎ**,*
***г. Рагачоў***

*Калекцыянерам, і не толькі*

## *Сокал-пустальга – птушка года*

У працяг серыі «Птушка года» выйшла новая марка **№ 815**, прысвечаная сокалу-пустальзе. Выпуск падрыхтаваны пры садзеянні грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (на мініяцюры змешчаныя лагатыпы гэтага аб'яднання і міжнароднай арганізацыі па ахове птушак «BirdLife International»). Яе памер 37х26 мм, намаляваў Аляксандр Міцянін, наклад – 70 тыс. асобнікаў. Надрукаваная ў аркушах па 7 марак і 1 купон, палі якога па-мастацку аздобленыя.

Пустальга (з атрада сокалападобных) пашыраная ў Еўразіі, Афрыцы. У нас яна – рэдкі пералётны від. Прылёт 20 сакавіка – 26 красавіка (звычайна 7–14 красавіка). Народныя назвы шулячок, аралок. Занесеная ў Чырвоную кнігу. Найчасцей трапляецца ў малалесных раёнах на захадзе і ўсходзе, жыве ў невялікіх лясах і на высечках, палях і лугах, узлесках з асобнымі дрэвамі. Колькасць асабліва зменшылася на пачатку 1970-х гадоў з-за адстрэлу, які вёўся да канца 1960-х. Харчуецца мышападобнымі грызунамі, а таксама птушкамі, яшчаркамі, жамярой.



Даўжыня цела 35–38 см, маса 180–285 г, самка большая за самца. У самца галава попельна-шэрая з даўгаватымі штрыхамі, горла белае, надхвосце і хвост шызыя, спіна чырванавата-карычневая з круглымі стракацінамі, брушка вохрыстае з падоўжанымі стракацінамі, на канцы хваста чорная паласа. Крылы доўгія, завостраныя.




У самкі верх іржава-рыжы з папярочнымі палосамі, галава амаль аднаго колеру са спінай. Маладыя птушкі больш бледныя. У палёце пустальга часта затрымліваецца з прыўзнятымі крыламі і апушчаным хвастом, пырхае на месцы («трасецца»).

У дзень выхаду маркі на паштамце ў Мінску праводзілася спецгашэнне на канверце «Першы дзень», аўтар якіх А. Міцянін. Падрыхтаваная таксама паштоўка для картмаксімума.

## *Пісьменнік і акадэмік*

Выйшла **марка № 814**, прысвечаная творчасці народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі. Намалявала яе Галіна Ермаловіч, памер – 52х29,6 мм, наклад 50 тысячаў асобнікаў. Надрукаваная ў малым аркушы – 5 марак і 1 купон. На купоне – аркушы рукапісу, ручка і надпіс «Народны пісьменнік Беларусі Іван Навуменка – 85 гадоў з дня нараджэння». На палях блока змешчаныя аўтограф І. Навуменкі, а таксама выявы класікаў беларускай літаратуры – М. Багдановіча, Змітрака Бядулі ды іншых, творчасць якіх ён даследаваў.

У дзень выхаду на Мінскім паштамце праводзілася спецгашэнне на канверце «Першы дзень», якія намалявала Г. Ермаловіч. На канверце – выява Акадэміі навук Беларусі, адным з кіраўнікоў якой доўгі час быў І. Навуменка.




***Вялікі дзякуй за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялаў рубрыкі супрацоўнікам выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта»***

## Творчасць нашых чытачоў

### Я прашу ...

Я прашу цябе, Бог, адвярні
Ад маёй Беларусі пакуты,
Як дачушку, яе прытулі,
Каб ад гора не стала сагнутай.

Я прашу, каб мой любы народ
Не гарэў у ваенным пажары,
А Чарнобыля лютасны год
Не забраў больш ніводнай ахвяры.

Няхай белыя пары буслоў
Прылятаюць у родныя вёскі,
І няхай кучараваяца зноў
На грудочку сяброўкі-бярозкі.

Я прашу цябе, Бог, назаўжды
Захавай для нашчадкаў крыніцы,
Каб празрыстай і чыстай вады
Нашы дзеці змаглі напіцца.

Я прашу цябе, Бог!

### Памяць

Ціха стаяць, пахіліліся хаткі,
Ад ветру старэнькія дзверы рыпяць,
Забітыя вокны, бы тыя заплаткі,
З дакорам і болем наўкола глядзяць.

А памяць пакліча ў былое дзяцінства,
У яблычны водар і спеў певуноў,
Дзе час не пускае да вёскі злачынства,
Дзе лёгка душы, што яшчэ без грахоў.

Свавольна крычаць вераб'і пад страхою,
Уранку бабуля аладкі пячэ,
Пагладзіць галоўку шурпатай рукою,
Спытае ласкава: «Мо, хочаш яшчэ?»

Стаміўся ад клёкату бусел цыбаты,
Дзядуля ля пчолак дымар запаліў,
Суседзі паклічуць на кубак гарбаты
Пад клён, што да хмаркі пляچо прытуліў.

Ціха стаяць, пахіліліся хаткі,
Ад ветру старэнькія дзверы рыпяць,
Забітыя вокны, бы тыя заплаткі,
З дакорам і болем наўкола глядзяць.

### Ефрасіння

Жанчына стомлена прысела.
Агеньчык тухне, ледзь гарыць.
Яна ўсё ж такі паспела
Радзіме крыж свой падарыць.
Свой крыж нясла, свае нягоды,
Прасіла Бога за людзей.
І нават ворагі да згоды
Пры ёй імкнуліся скарэй.
Бы лёгкай птушкай узлятае
Царква – наш Збаўца – над зямлёй,
Званамі ў душу пранікае
І растваряецца ў ёй...

**Ірына КАСЯНКОВА,**
**настаўніца Наваельненскай СШ,**
**Дзятлаўскі раён**



«Захавай для нашчадкаў крыніцы...»

Фота Міколы ПІВАВАРА

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

**(Пачатак у № 1 за 2003 год)**

**КАТРЫНКА, шарманка** – механічны духавы музычны інструмент. Абедзве назвы паходзяць ад папулярнай французскай песенькі «Charmante Catherine», якая першапачаткова выконвалася на катрынцы ў Расіі (на Аршаншчыне вядомая таксама пад назвай «шарман»). Мела выгляд скрынкі з ручкай (пярэдняя сценка ўпрыгожвалася яркай карцінкай) шырынёй каля 1 м, вышынёй 0,8 м, глыбінёй 0,7 м. Унутры размяшчаліся гучальныя трубкі, спецыяльны механізм для размеркавання паветра, мяхі і некалькі валікаў з металічнымі шпількамі.

Створаны інструмент у 1-й пал. XVIII ст. у Італіі, у 2-й пал. XVIII ст. пашырыўся ў Заходняй Еўропе, у XIX ст. – на землях Польшчы, Беларусі, Расіі і Украіны. Стала інструментам вандроўных музыкаў. Рэпертуар беларускіх катрыншчыкаў складаўся з 3–4 п'есаў («жорсткі» раманс «Разлука», вальс «Разбітае сэрца» і інш.). Часта катрыншчык падпяваў сваёй катрынцы. У канцы XIX – пач. XX ст. інструмент стаў неад'емнай з'явай гарадскога і мястэчковага побыту, любімай забавай гарадскіх нізоў і дзяцей. Найбольш прадпрымальныя катрыншчыкі спалучалі музыканцтва з варажбою пры дапамозе «вучонага» папугая. Катрынка канчаткова знікла ў канцы 1920-х гг.



Катрынка

**КАЎБАСА** – мясны выраб. Лакальная назва – кілбаса. Прадукт харчавання з адмыслова прыгатаванага фаршу. Мяккае мяса з лапатак і інш. частак свіной тушы, часам паляндвіцу, дробна сякуць, рэжуць (у наш час пракручваюць на мясарубцы), дадаюць парэзанае сала, соль, часнок, укроп, здрабнёны лаўровы ліст, гарчыцу, каляндру, кмен, перамешваюць і гэтым шчыльна начыняюць тонкія свіныя кішкі або штучныя абалонкі. Раней мяса напіхвалі ў кішку рукой, развёўшы яе дроцікам або лубяной дужкай. У наш час – праз трубку, якую прымацоўваюць на мясарубку. Напханую каўбасу завязваюць у кольцы, вешаюць пад страхой вяліцца. Некаторыя спачатку падсушваюць над печчу, потым перавешваюць у халоднае месца для захоўвання, часам вэндзяць.

Сухую свіную каўбасу захоўвалі да лета, спажывалі ў святы, у пару працаёмкіх сельгаспрацаў.

Рабілі таксама вараную каўбасу з вантробаў (вантрабянку) – ліверную (ліверку) і з дадаваннем крыві і сала – крывяную (крывянку). Такія каўбасы спажывалі адразу, а не захоўвалі. Часам адвараную крывянку ахалоджвалі, паклаўшы пад гнёт.

**КАФЛЯ** – (ад ням. Kachel), керамічны выраб для абліцоўкі і дэкаратыўнага аздаблення печаў, грубак, камінаў, сценаў кухні, ванны і інш. Уяўляе сабою плітку, тыльны бок якой мае выгляд адкрытай каробкі (румпы) для замацавання ў муроўцы. Паводле формы і прызначэння падзяляюцца на сценныя, вуглавыя, паясовыя, карнізныя, а таксама перамычкі, каронкі, дахоўкі, балясіны, медальёны і інш. Паводле мастацкага аздаблення бываюць гладкія і рэльефныя, тэракотавыя і паліваныя празрыстай і каляровай палівай, размаляваныя.

На Беларусі выраб кафлі пашыраны з XIV ст. У дэкоры выкарыстоўвалі геаметрычныя, раслінныя, анімалістычныя матывы, партрэтныя і геральдычныя вывы, сюжэтныя сцэны.

У канцы XVI – 1-й пал. XVII ст. беларускае кафлярства дасягнула найбольшага росквіту. З 2-й пал. XVII ст. кафлю выраблялі ў т.зв. дывановым стылі, дзе кожная асобная частка складала фрагмент агульнага малюнка. Беларускае кафлярства XVII ст. значна ўплывала і на развіццё вытворчасці кафлі ў Рускай дзяржаве, дзе працавалі беларускія майстры з Копысі, Мсціслава, Дуброўны, Віцебска і інш. гарадоў (іх вырабамі аздоблены Церамны палац Крамля, Круціцкі церам, царква Георгія Неакесарыйскага ў Маскве, Уваскрасенскі сабор Новаіерусалімскага манастыра ў Істры і інш.).

У канцы XIX – пач. XX ст. у Беларусі працавалі заводы ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Івянцы, Копысі, Мінску, Магілёве, Навагрудку і інш. паселішчах, прадукцыя экспартавалася і за мяжу. Рэльефную кафлю з савецкай сімволікай у 1920–1930-я гг. выпускаў Копыскі кафляны завод.



Мінская кафля, XVII ст.



Кафля (медальён), пач. XX ст.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамасны – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Камунальная набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26, 334 61 62.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары дасылаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 15.04.2010.
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.
Заказ 376.
Тыраж 1170 асобнікаў.